ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# ГОМЕЛЬСКІ УНІВЕРСІТЭТ



№ 10(1023) | АЎТОРАК, 28 мая 2002 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная

## НАРАДА РЭКТАРАЎ КРАІНЫ

Наш горад стаў месцам правядзення нарады рэктараў ВНУ Рэспублікі Беларусь, якая была арганізавана Міністэрствам адукацыі і праходзіла ў чацвер-пятніцу на мінулым тыдні. З дакладам "Аб праблемах рэгіянальнай падрыхтоўкі спецыялістаў" выступіў рэктар ГДУ імя Ф.Скарыны доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар, заслужаны работнік адукацыі краіны, член Савета Рэспублікі, старшыня Савета рэктараў Гомельшчыны М.В.Селькін. З садакладамі па гэтаму пытанню выступілі рэктары ВНУ Гомельшчыны.

Справаздачу аб праведзенай нарадзе чытайце ў наступным нумары нашай газеты.

## ДЛЯ ЭФЕКТЫЎНАГА РАЗВІЦЦЯ РЭГІЁНАЎ

На працягу трох дзён у нашым горадзе праходзіла І Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя "Трансфер тэхналогій у свабодных эканамічных зонах. Тэндэнцыі. Тэорыі і практыка". Яе арганізавала і правяла адміністрацыя свабоднай эканамічнай зоны "Гомель-Ратон". Для абмеркавання важнейшых эканамічных, экалагічных і сацыяльных праблем у Гомель прыехалі шырокавядомыя вучоныя Санкт-Пецярбурга, Масквы, Навасібірска, Кіева, навуковыя і практычныя работнікі Мінска і абласных цэнтраў рэспублікі.

Сярод заслуханых на пленарным пасяджэнні быў даклад прарэктара нашага універсітэта па навуковай рабоце прафесара Д.Р.Ліна і вядучага інжынера-патэнтазнаўцы М.Ф.Ярмалкевіча "Навукаёмістыя і канкурэнтназдольныя распрацоўкі вучоных ГДУ імя Ф.Скарыны".

Група нашых вучоных выступіла з навуковымі дакладамі на секцыйных пасяджэннях. Сярод іх – загадчыкі кафедр доктар філалагічных навук, прафесар У.І.Коваль, дацэнты Б.У.Сарвіраў, А.Ю.Трацэўская, дацэнты кафедр М.С.Далінскі, В.В.Пугачова. Сааўтарамі навуковых паведамленняў сталі і некаторыя іншыя навукоўцы універсітэта.

У рамках канферэнцыі адбылася прэс-канферэнцыя Міжнароднага навуковага праграмнага камітэта, у якой прынялі ўдзел прафесар Д.Р.Лін і рэдактар газеты "Гомельскі універсітэт" У.П.Балога.

Да канферэнцыі было прымеркавана ўручэнне ўзнагарод па выніках конкурсу, праводзімага СЭЗ "Гомель-Ратон" па 8-мі намінацыях. Дзве з іх дасталіся прадстаўнікам нашага універсітэта. Прэмію за "Аўтаматызаваныя распрацоўкі стройных сістэм" атрымала група маладых навукоўцаў на чале з начальнікам сектара новых інфармацыйных тэхналогій ІВЦ А.А.Федарцовым, у якую ўваходзілі таксама А.І.Талкачоў, І.Ю.Ермалаеў, В.А.Літвінаў, І.В.Коршунаў, І.І.Ганчарэнка. Сярод студэнтаў прэміі ўдастоена пяцікурсніца эканамічнага факультэта Алена Сілуянава.

У час работы канферэнцыі група вучоных Санкт-Пецярбурга наведала наш універсітэт, дзе на фізічным факультэце азнаёмілася з распрацоўкамі лабараторыі лазерных тэхналогій, прадугледжаных для ўкаранення ў сучасную медыцыну, і некаторымі іншымі пытаннямі, якія цікавяць вучоных-медыкаў.

## СКАРЫНА І НАШ ЧАС

Гэтай тэме прысвячалася ІІ Міжнародная навуковая канферэнцыя, якую арганізавалі і правялі 16-17 мая г.г. Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны, грамадскае аб'яднанне таварыства Кірылы Тураўскага і Гомельская спецыялізаваная славянская бібліятэка.

Пленарнае пасяджэнне канферэнцыі праходзіла ў грамадскім культурным цэнтры. Яе ўдзельнікаў цёпла віталі прарэктар па навуковай рабоце ГДУ імя Ф.Скарыны доктар тэхнічных навук, прафесар Д.Р.Лін і член аргкамітэта, загадчык кафедры беларускай філалогіі Варшаўскага універсітэта габілітаваны доктар А.А.Баршчэўскі. Затым былі заслуханы навуковыя даклады старшага навуковага супрацоўніка аддзела гісторыі філасофіі Інстытута філасофіі НАН Беларусі кандыдата філасофскіх навук У.У.Агіевіча, загадчыка кафедры беларускай філалогіі Варшаўскага універсітэта А.А.Баршчэўскага, загадчыка аддзела гісторыі беларускай мовы Інстытута мова-знаўства імя Я.Коласа НАН Беларусі, члена-карэспандэнта Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктара філалагічных навук, прафесара А.М.Булыкі, загадчыка кафедры філасофіі ГДУ імя Ф.Скарыны доктара філасофскіх навук, прафесара У.М.-Калмыкова, загадчыка кафедры беларускай мовы ГДУ імя Ф.Скарыны доктара філалагічных навук, прафесара А.А.Станкевіч.

Канферэнцыя працягвала сваю работу на базе ГДУ імя Ф.Скарыны. Працавалі 4 секцыі: "Гісторыя, правазнаўства, культуралогія і педагогіка", "Літаратуразнаўства і мастацтвазнаўства", "Мовазнаўства", "Філасофія і палітыка". На іх заслухана і абмеркавана каля 30 навуковых дакладаў, аўтарамі якіх у пераважнай большасці сталі навукоўцы ГДУ.

Адметнасцямі канферэнцыі з'явілася прадстаўленне ва універсітэцкім музеі-лабараторыі Ф.Скарыны карціны "Доктар Францыск Скарына" мастачкі з Нью-Йорка Тамары Стагановіч і прэзентацыя кнігі амерыканскага хірурга, доктара медыцыны Дональда М.Кодара "Мой Францыск Скарына". Вучоны з ЗША выступіў таксама на адной з секцый навуковай канферэнцыі. Пры падвядзенні вынікаў яе работы былі прыняты адпаведныя рэкамендацыі.

## БРАВА!

На Міжнародным фестывалі маладзёжных фальклорных калектываў, які адбыўся ў г.Бранску, фальклорны ансамбль "Валошкі" (мастацкі кіраўнік А.Эбзеева) удастоены дыплома І ступені. Такую ж узнагароду з Рэспубліканскага фестывалю харэаграфічнага мастацтва ВНУ прывёз і народны фальклорна-харэаграфічны ансамбль "Радзімічы" (мастацкі кіраўнік А.Лысянкоў).

### В РЕДАКЦИЮ ГАЗЕТЫ "ГОМЕЛЬСКІ УНІВЕРСІТЭТ"

Выражаю искреннюю благодарность доктору педагогических наук, профессору, академику НАН Беларуси Ивану Федоровичу Харламову за научное руководство диссертационным исследованием. Научная школа академика Харламова Ивана Федоровича, признанная не только у нас в стране, но и за ее пределами, позволила мне приобрести опыт исследовательской работы, систематизировать научно-педагогические знания и успешно защитить кандидатскую диссертацию.

Общение с Иваном Федоровичем показало его нравственные качества, которые являются примером высоких этических позиций ученого и человека.

Желаю Ивану Федоровичу крепкого здоровья, творческих успехов.

**Старший преподаватель кафедры педагогики Мозырского государственного университета Т.Н.Савенко.**

## ДАПАМОГА СТУДЭНЦКІМ СЕМ'ЯМ

Бюджэт студэнцкіх сем'яў, вядома, не надта багаты. А калі ў іх яшчэ ёсць і маленькія дзеці, расходы на якіх па сённяшніх цэнах "з'ядаюць" шмат грашовых сродкаў, нялёгка даводзіцца маладым бацькам. Таму вельмі добрай падтрымкай для такіх сем'яў стане выдача ім сухога дзіцячага харчавання, атрыманага прафкамам студэнтаў ГДУ ад Міжнароднага дабрачыннага грамадскага аб'яднання "Дапамога дзецям Чарнобыля".

Гуманітарны груз з Германіі быў дастаўлены на Гомельшчыну да 16-й гадавіны аварыі на ЧАЭС. Дзякуючы намаганням галоўнага ўрача універсітэцкага санаторыя-прафілакторыя А.М. Сабалеўскага 76 скрынак з сухімі сумесямі і дзіцячым чаем на агульную суму звыш 1300 еўра выдзелены і для ГДУ. Дапамога будзе размеркавана каля 100 студэнцкім сем'ям, якія маюць дзяцей ва ўзросце да 1,5 года.

З гэтай жа партыі гуманітарнай дапамогі для харчавання студэнтаў у сталовую санаторыя-прафілакторыя перададзена 700 кг сухога малака.

## З УНІВЕРСІТЭТАМ ЗНАЁМІЛІСЯ АБІТУРЫЕНТЫ

Пры запоўненай актавай зале 18 мая пачаўся "Дзень адкрытых дзвярэй" у Гомельскім дзяржаўным універсітэце імя Ф.Скарыны. Тут сабраліся будучыя яго абітурыенты, некаторыя з іх бацькоў.

Традыцыйную сустрэчу з будучымі абітурыентамі адкрыў прарэктар па вучэбнай рабоце доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар С.Ф.Каморнікаў. Ён цёпла павіншаваў тых, хто жадае набываць вышэйшую адукацыю ў вядучай ВНУ Беларускага Палесся, пазнаёміў іх з дэканамі факультэтаў. Сяргей Фёдаравіч падрабязна расказаў аб гісторыі універсітэта, яго факультэтах, спецыяльнасцях і спецыялізацыях, прадстаячым пераходзе вышэйшай школы на новую сістэму адукацыі. Ён гаварыў таксама аб усім тым лепшым, чым сёння ганарыцца ГДУ, аб яго далейшых перспектывах.

Вялікая ўвага была звернута на асаблівасці сёлетніх правілаў уступных экзаменаў. На шматлікія пытанні прысутных вычарпальныя адказы далі С.Ф.Каморнікаў і адказны сакратар прыёмнай камісіі С.А.Хахомаў.

У гэты дзень юным гасцям прадставілася магчымасць наведаць абраныя факультэты, дзе яны маглі больш падрабязна азнаёміцца з адпаведнымі спецыяльнасцямі і спецыялізацыямі, арганізацыяй вучэбнага працэсу, лабараторыямі, пагутарыць не толькі з дэканамі, але і з загадчыкамі кафедр, вядучымі выкладчыкамі, каб без паспешнасці вызначыцца ў выбары сваёй будучай прафесіі.

## ВІНШУЕМ!

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты геолага-геаграфічнага факультэта горача віншуюць вядучага спецыяліста кафедры геалогіі і разведкі карысных выкапняў **ЖОГЛУ Васіля Гаўрылавіча** з паспяховай абаронай дысертацыі на атрыманне вучонай ступені доктара геолага-мінералагічных навук.

## ДАБРЫНЁЙ НАПОЎНЕНЫЯ СЭРЦЫ

Міжнародная грамадская дабрачынная арганізацыя "Надзея-Экспрэс" і яе Валанцёрскі цэнтр "Крок насустрач!" пры падтрымцы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь з'явіліся ініцыятарамі правядзення ў рэспубліцы дабрачыннай акцыі "Вясенні Тыдзень Дабрыні-2002". Гэта акцыя, якая стала ўжо традыцыйнай, была прымеркавана да буйнейшага Міжнароднага маладзёжнага праекта "Сусветны Дзень Маладзёжнага Служэння", аб удзеле ў якім заявілі 146 краін свету, і сярод іх Беларусь. Яе мэта – зрабіць разам шмат добрых карысных спраў для людзей, паляпшэння навакольнага асяроддзя, падтрымаць маладзёжныя валанцёрскія ініцыятывы, якія існуюць у многіх навучальных установах і арганізацыях, запрасіць да ўдзелу ў валанцёрскім руху як мага больш людзей усіх узростаў і прафесій.

ГДУ выступіў як арганізатар "Вясенняга Тыдня Дабрыні" ў рамках нашай навучальнай установы пад дэвізам "Няхай яшчэ доўга не гасне агонь, які запальвае факел святла і дабрыні ў студэнцкіх сэрцах". Студэнты, выкладчыкі ГДУ актыўна адгукнуліся на каштоўную ініцыятыву і прынялі ўдзел у шматлікіх мерапрыемствах, прапанаваных агульнай праграмай "ВТД", а таксама ў пасяджэнні круглага стала "Быць чалавекам", акцыях міласэрнасці "Не без добрых душ на свеце", "У сэрцы – дзеці", "Кнігі – дзецям", "Падаруем дзецям свята", "Веды – аддай!", "Боль і клопат наш". Сабраныя студэнтамі кнігі, падарункі, канцылярскія прыналежнасці перададзены ў шматдзетныя сем'і, дзецям-інвалідам, у абласное аддзяленне Беларускага дзіцячага фонду. Першакурснікі эканомфака спецыяльнасці "Фінансы і крэдыт" наведвалі сірот у Гомельскім дзіцячым доме змешанага тыпу, дзе ўручылі ім не толькі ласункі і падарункі, але і падаравалі ім радасць зносін: арганізавалі захапляючыя гульні, прагулкі.

У рамках Тыдня для студэнцкай і школьнай аўдыторый праведзены гутаркі па прафілактыцы СНІДу, наркаманіі, курэння, насельніцтву горада і вучням сярэдніх школ дадзены юрыдычныя і прадметныя кансультацыі, аказана канкрэтная дапамога ліквідатарам аварыі на ЧАЭС і г.д. Папрыгажэла прылягаючая да універсітэта тэрыторыя, дзе праведзены пасадкі кустоў, дрэваў, кветак, разбіты клумбы, устаноўлены бардзюры.

Актыўны ўдзел студэнцкай моладзі ГДУ ў дабрачыннай акцыі – іх пасільны ўклад у паляпшэнне нашага агульнага жыцця, абуджэнне дабрыні ў сэрцы кожнага чалавека.

**Т.НІКАЛАЕВА.**

## З УЗНАГАРОДАЙ!

За шматгадовую плённую працу, добрасумленныя адносіны да выканання службовых абавязкаў, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці універсітэта і ў сувязі з 60-годдзем з дня нараджэння прарэктар па адміністрацыйна-гаспадарчай рабоце **НАВУМЕНКА Пётр Мікітавіч** узнагароджаны Ганаровай граматай універсітэта.

* * *

За шматгадовую плённую вучэбную і выхаваўчую работу па падрыхтоўцы маладых спецыялістаў, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці Ганаровымі граматамі універсітэта ўзнагароджаны дацэнт кафедры тэорыі і практыкі англійскай мовы **ЖЫЛІНА Ірына Кірылаўна** і старшы выкладчык гэтай жа кафедры **ПАГУДЗІНА Галіна Іванаўна**.

# ЛАЎРЭАТЫ СКАРЫНАЎСКІХ ЧЫТАННЯЎ – 2002



**АФАНАСЬЕЎ**
**Іван Мікалаевіч -**
**кандыдат філалагічных навук,**
**дацэнт кафедры рускай літаратуры**

*

Цыкл работ "Мастацкае асэнсаванне чарнобыльскай эпохі і вопыт нацыянальнай літаратуры" ўключае два даследаванні.

Манаграфія "Чарнобыльскае светаадчуванне ў беларускай літаратуры" прадстаўляе чытачу сучасны літаратурны працэс у люстэрку чарнобыльскай свядомасці як шмат у чым вызначальнага фактару нацыянальнага бачання свету. Аўтар выходзіць за межы выключна "тэматычнага" разумення праблемы і акцэнтуе светапоглядны аспект пытання, калі слова ў мастацкай прасторы, акрэсленай усімі магчымымі набыткамі прыгожага пісьменства, абумоўлівае шанц альтэрнатывы ў спрэчцы з непазбежнасцю сапраўднай катастрофы, а нацыянальная гісторыя здзяйсняецца як намаганне літаратуры. Чарнобыльскае светаадчуванне для аўтара – гэта найперш утаймаванне трагічнай невядомасці ў каардынатах культуры.

Практычны дапаможнік "Руская літаратура XX стагоддзя" – гэта тэзіснае выкладанне пытанняў з указаннем важнейшых навуковых крыніц, якія студэнт можа выкарыстаць у працэсе падрыхтоўкі да экзамена. Па гэтай прычыне перавага аддаецца найбольш даступным публікацыям у навуковай перыёдыцы. Мэта дапаможніка – забяспечыць метадычна-эфектыўную, якасную падрыхтоўку да дзяржаўнага экзамена па рускай літаратуры XX стагоддзя, якая ўлічвае прынцыповыя змены ў інтэрпрэтацыі і ацэнцы літаратурных фактаў, выкліканых развіццём гісторыка-грамадскага кантэксту і актуалізацыяй адэкватнага яму эстэтычнага патэнцыялу мастацкай літаратуры.



**ГАТАЛЬСКАЯ**
**Галіна Віктараўна –**
**кандыдат педагагічных навук, дацэнт, загадчык кафедры сацыяльнай і педагагічнай псіхалогіі**

*

Аўтар цыкла работ "Псіхолага-педагагічныя фактары, якія вызначаюць характар эфектыўнага педагагічнага ўзаемадзеяння". У яго ўваходзяць дзве кнігі: манаграфія "Педагагічнае ўзаемадзеянне: ад асэнсавання да змен" (1999 г.) і навукова-практычны дапаможнік "У школу – з радасцю. Практычная псіхалогія для настаўніка" (у сааўтарстве з А.В.Крыленка).

Дадзеная тэматыка распрацоўвалася Г.В.Гатальскай з 1994 года, ёю апублікавана 19 работ, на працягу некалькіх гадоў чыталіся лекцыі для педагогаў Гомельскага рэгіёна, праводзіліся аўтарскія курсы.

Праблема эфектыўнага педагагічнага ўзаемадзеяння ў апошнія гады займае адно з вядучых месц у айчынных і замежных даследаваннях. У манаграфіі яна разглядаецца з пазіцый гуманістычнага выхавання. Кніга насычана рэальнымі прыкладамі, якія дапоўнены арыгінальнымі ілюстрацыямі. Мова яе, навуковая, і разам з тым даступная, дазваляе прымяняць напісанае не толькі ў педагагічнай дзейнасці, але і ў паўсядзённым жыцці.

Выданне "У школу – з радасцю" – практычны дапаможнік настаўніку на кожны дзень. Аўтар знаёміць чытача з псіхалагічнымі цяжкасцямі, якія ўзнікаюць у дзяцей, дае парады пасяховага вырашэння іх. Як арганізаваць эфектыўнае ўзаема-дзеянне, ад якіх фактараў гэта залежыць, аб тым, як канструктыўна вырашыць канфліктныя сітуацыі і аб многім іншым можна даведацца з кнігі. Прадстаўленыя раздзелы практычнай псіхалогіі могуць быць выкарыстаны студэнтамі, настаўнікамі, а таксама выкладчыкамі вышэйшых навучальных устаноў.



**КРЫВАШЭЕВА**
**Ларыса Мікалаеўна –**
**кандыдат эканамічных навук, дацэнт кафедры эканамічных тэорый**

*

Аўтар манаграфіі "Пераходная эканоміка і зямельная рэформа ў аб'ектыве эканамічнай тэорыі", выдадзенай у сааўтарстве з Б.У.Сарвіравым.

У манаграфіі разгледжаны асноўныя тэарэтычныя праблемы фарміравання пераходнай эканомікі і правядзення зямельнай рэформы як важнейшай складаючай трансфармацыі эканамічнай сістэмы.

Складаецца манаграфія з двух раздзелаў. У першым раздзеле вызначаны праблемы пераходнай эканомікі, якія ўяўляюць асаблівую складанасць, звязаную з сацыяльнай пераарыентацыяй рыначных рэформ і марудным змяненнем арганізацыйнага стану, што склаўся ў эканоміцы. Прадстаўлены аналіз сацыяльна-эканамічнага зместу інстытуцыянальнай структуры ў трансфармуемай эканоміцы, а таксама характар і асаблівасці яе функцыяніравання.

У другім раздзеле манаграфіі прыведзена значная колькасць канкрэтнага матэрыялу па аграрнай праблематыцы. Узнята праблема рэфарміравання зямельнага ладу Беларусі, якая закранае інтарэсы практычна ўсіх пластоў грамадства. Якой павінна быць зямельная рэформа, хто павінен быць гаспадаром зямлі, як захаваць урадлівасць глебы і забяспечыць якаснымі прадуктамі харчавання насельніцтва і сыравінай прамысловасць краіны – на гэтыя пытанні адказвае аўтар. На аснове тэарэтычных абагульненняў прапанаваны рэкамендацыі па захаванню і павышэнню эканамічнай урадлівасці глебы.

Кніга разлічана на навуковых работнікаў, спецыялістаў у галіне аграрных адносін, выкладчыкаў і студэнтаў, якія вывучаюць эканамічную тэорыю.



**ЛАЗЬКО**
**Рыгор Рыгоравіч –**
**доктар гістарычных навук, дацэнт кафедры ўсеагульнай гісторыі**

*

Аўтар манаграфіі "Перад патопам. Еўрапейская палітыка Польшчы (1932-1939 гг.)".

У манаграфіі праведзена сістэмная рэканструкцыя еўрапейскай палітыкі Польшчы як супярэчлівага звяна версальскай сістэмы міжнародных адносін ва ўмовах паглыблення яе крызісу і развалу. Упершыню ў гістарыяграфіі еўрапейская палі-тыка міжваеннай Польскай Рэспублікі прааналізавана ў якасці складанага і заканамернага працэсу, абумоўленага, з аднаго боку, уплывам нацыянальных і гістарычных стэрэатыпаў, а з другога – ціскам рэальнага геапалітычнага асяроддзя і супярэчнасцямі існаваўшай сістэмы міжнародных адносін. Сукупнасць навукова абгрунтаваных вынікаў, атрыманых у манаграфіі, стварае сістэму навуковых уяўленняў аб вытоках, асноўных знешніх фактарах і акалічнасцях вераснёўскай (1939 г.) катастрофы Польскай Рэспублікі, забяспечвае развіццё гістарыяграфіі шэрагу міжнародных праблем гэтага перыяду. Праведзенае даследаванне ўмацоўвае метадалагічныя і факталагічныя асновы вывучэння геапалітычнага кантэксту заходнебеларускага нацыянальнага руху, ролі Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны ў еўрапейскай стратэгіі Польшчы.

Атрыманыя аўтарам вынікі маюць базавае значэнне для развіцця даследаванняў па навейшай гісторыі Польшчы і гісторыі міжнародных адносін навейшага часу. Сістэма палажэнняў і вывадаў можа быць выкарыстана пры падрыхтоўцы вучэбнай літаратуры для сярэдняй і вышэйшай школы (па спецыяльнасцях "Гісторыя" і "Міжнародныя адносіны").



**НАРСКІН**
**Генадзій Іванавіч –**
**кандыдат педагагічных навук, дацэнт кафедры аздараўленчай і лячэбнай фізкультуры**

*

Аўтар цыкла работ, якія ўключае манаграфію "Прафілактыка дэфармацый зводаў ступні ў дзяцей сярэдняга школьнага ўзросту сродкамі фізічнага выхавання" і дапаможнік для педагогаў дашкольных устаноў з грыфам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь "Фізічная рэабілітацыя і ўмацаванне здароўя дашкольнікаў" (у сааўтарстве з М.В. Каняхіным і В.А. Кавалёвай).

У названых работах асвятляюцца пытанні па аздараўленню дзяцей дашкольнага і школьнага ўзросту сродкамі фізічнага выхавання, якія пражываюць у экалагічна неспрыяльных умовах, прафілактыкі і карэкцыі адхі-ленняў апорна-рухальнага апарату дзяцей рознага ўзросту. Адлюстраваны падыходы да выкарыстання сродкаў фізічнай культуры як даступнага і дзейнічаючага сродку аздараўлення, прафілактыкі і рэабілітацыі адхіленняў, якія найбольш часта сустракаюцца ў стане здароўя сярод дзяцей і падлеткаў, прыводзяцца эксперыментальныя дадзеныя, якія сведчаць аб эфектыўнасці выкарыстоўваемых сродкаў. Разгледжаны пытанні планавання і арганізацыі фізкультурна-аздараўленчай работы, загартоўкі, рацыянальнага харчавання, фізія- і фітатэрапіі. Апісаны комплексы лячэбнай і аздараўленчай фізкультуры. Рэалізацыя прапанаваных рэкамендацый будзе садзейнічаць умацаванню і павышэнню ўзроўню здароўя падрастаючага пакалення, ліквідаванню парушэнняў і прафілактыцы захворванняў.

Прафсаюзнае жыццё

## ДА СТУДЭНЦКІХ СПРАЎ – НОВЫ ПАДЫХОД

***Адбылася справаздачная канферэнцыя пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі студэнтаў універсітэта. Напярэдадні яе на факультэтах, у акадэмічных групах прайшлі справаздачна-выбарныя канферэнцыі і сходы, на якіх быў выбраны новы прафсаюзны актыў, абмяркоўваліся пытанні арганізацыі вучобы, быту, адпачынку студэнцкай моладзі.***

Са справаздачным дакладам аб рабоце прафкама студэнтаў ГДУ з кастрычніка 1999 г. па май 2002 г. перад дэлегатамі універсітэцкай канферэнцыі выступіла яго старшыня Н.І.Колтышава.

Сёння ва універсітэце па дзённай форме навучання займаецца 5406 студэнтаў, з іх 5392 чалавекі з'яўляюцца членамі галіновага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі. Як ажыццяўляецца адна з галоўных задач студэнцкай прафсаюзнай арганізацыі – сацыяльная абарона яе членаў – гаварылася ў справаздачным дакладзе. Яе вырашэнню ў многім садзейнічае заключанае Пагадненне па сацыяльна-эканамічных пытаннях паміж адміністрацыяй (рэктаратам) і калектывам студэнтаў, якое адлюстроўвае ўсе сферы жыццядзейнасці моладзі – вучэбна-вытворчыя пытанні, матэрыяльнае забеспячэнне, вучэбную, працоўную дысцыпліну, ахову працы, аздараўленне студэнтаў, жыллёва-бытавыя праблемы, культурную і спартыўна-масавую работу. Пры наяўнасці беспрацоўя вельмі важна, каб выпускнікі ВНУ былі канкурэнтназдольнымі ва ўмовах рынку. Пагадненне прадугледжвае сістэму матэрыяльнага стымулявання студэнцтва, і на гэтыя мэты выдзяляецца 4% стыпендыяльнага фонду. Ва універсітэце дзейнічае і Палажэнне па аказанню матэрыяльнай дапамогі, на якую расходуецца са стыпендыяльнага фонду 1,5%, а з прафсаюзных узносаў – 15-18%.

Дзякуючы комплекснай праграме мерапрыемстваў, у якой задзейнічаны работнікі здраўпункта, санаторыя-прафілакторыя, прадпрыемства грамадскага харчавання, камісіі па аздараўленню і санаторна-курортнаму лячэнню, намеснікі дэканаў па спартыўна-масавай рабоце, студэнты забяспечваюцца медыцынскім абслугоўваннем, паўнацэнным харчаваннем (у тым ліку льготным і дыетычным), пуцёўкамі на адпачынак, аздараўленне і лячэнне.

Прафкам студэнтаў фінансуе правядзенне культурных і спартыўна-масавых мерапрыемстваў. У мінулым годзе на гэтыя мэты было выкарыстана 54% прафсаюзнага бюджэту. Карысна, змястоўна праводзіць вольны час студэнтам дапамагае Маладзёжны комплекс універсітэта. Звыш 40 спецыялістаў у галіне культуры і мастацтва сумесна з выкладчыкамі далучаюць моладзь да актыўнага ўдзелу ў шматлікіх творчых аб'яднаннях, да каштоўнасцей айчыннай і сусветнай культуры. Спартыўным клубам у рамках круглагадовай спартакіяды сярод студэнтаў праводзяцца спаборніцтвы па 14 відах спорту.

Справаздачу рэвізійнай камісіі прафкама зрабіла яе старшыня чацвёртакурсніца эканомфака А. Лабасава.

У абмеркаванні даклада прынялі ўдзел прафсаюзныя лідэры факультэтаў: біялагічнага – А.Пестрык, эканамічнага – В.Аксёнаў, юрыдычнага – А.Калеснік, гістарычнага – Д.Рамашка, чацвёртакурснік філфака С.Падсасонны, студэнтка першага курса фізічнага факультэта В.Глямбіцкая. Яны ўзнімалі хвалюючыя студэнцкую моладзь пытанні, праблемы ў арганізацыі вучэбнага і выхаваўчага працэсаў у ГДУ: недастатковая матэрыяльная база, узаемаадносіны выкладчыка са студэнтам (апошні часта ўспрымаецца, на жаль, проста як аб'ект навучання, а не як асоба), некаторыя аспекты інтэрнацкага жыцця.

На пытанні дэлегатаў вычарпальныя адказы далі рэктар ГДУ прафесар, член Савета Рэспублікі М.В.Селькін і начальнік аддзела выхаваўчай работы Г.І.Варонін, якія прынялі ўдзел у рабоце канферэнцыі. Міхаіл Васільевіч, у прыватнасці, станоўча ацаніў работу прафсаюзнага камітэта студэнтаў, падкрэсліўшы пры гэтым, што сённяшнім студэнтам давядзецца жыць і працаваць у новым грамадстве, у рыначных умовах і ім трэба больш спадзявацца на ўласныя сілы, веды, інтэлект, а не заставацца на пазіцыях утрыманства.

З мінулага года прафсаюзны камітэт студэнтаў ГДУ пачаў працаваць на правах райкама, таму цяпер яго састаў павялічваецца з 23 да 55 чалавек. Удзельнікі канферэнцыі правялі давыбары членаў прафкама, выбралі яго прэзідыум у складзе 13 чалавек, новыя кандыдатуры ўведзены і ў рэвізійную камісію, паколькі некаторыя яе члены ўжо заканчваюць вучобу ў ГДУ. На канферэнцыі прыняты ўмовы Пагаднення паміж рэктаратам і калектывам студэнтаў па сацыяльна-эканамічных пытаннях на 2002-2004 г.г. (яно будзе апублікавана на старонках нашай газеты).

Т.ДУБЯК.

# В УСЛОВИЯХ ВОЗРАСТАЮЩИХ ТРЕБОВАНИЙ К ОБРАЗОВАНИЮ

*

**С.КАМОРНИКОВ,**
**проректор по учебной работе**
**доктор физико-математических наук,профессор**

Проблема повышения качества подготовки специалистов с высшим образованием в последние годы принимает особое значение. Связано это с теми глобальными изменениями, которые происходят в мире.

Динамика функционирования и скорость развития технологий сегодня приводят к тому, что весь запас знаний и образования человека, приобретенный за два десятка лет его ученической жизни, исчерпывается и устаревает за 3-5 лет трудовой деятельности. В результате человек становится недостаточно компетентным как специалист, дезадаптированным как личность в изменяющейся жизни.

Естественно, что в таких условиях педагогическая система высшей школы должна своевременно отслеживать происходящие изменения и адаптироваться к ним. Задача педагогов высшей школы перейти к таким образовательным моделям, которые не только репродуцируют старые знания, но и готовят выпускников к решению принципиально новых проблем. Одной из таких моделей является модель, основанная на обучающе-исследовательском принципе организации учебного процесса (сокращённо ОИП). ОИП организации образовательного процесса – это принцип построения учебного процесса по схеме, в которой студенты приобретают соответствующие знания, умения и навыки через освоение методов проведения исследований и непосредственное вовлечение в научно-исследовательскую деятельность, что активизирует и формирует их творческие способности.

Перенасыщенность учебных планов подготовки студентов учебными дисциплинами, а самих учебных дисциплин содержанием обучения уже сегодня приводит к невозможности увеличения объема предлагаемых студентам знаний. Это в совокупности с тем, что общая подготовка абитуриентов падает, находит отражение в невозможности усвоения студентами в полном объеме существующих вузовских программ. Таким образом, сама жизнь подталкивает нас к развитию обучающе-исследовательского принципа.

Та же жизнь показывает, что выпускники вузов, имеющие хорошую фундаментальную подготовку, основанную на тесной связи с научно-исследовательской работой, более мобильны на рынке труда. А это, в свою очередь, означает, что сами студенты должны быть заинтересованы в продвижении ОИП.

Сегодня мы вполне ответственно констатируем, что в университете сложилась стройная система вовлечения студентов в научную деятельность во внеучебное время. Статистика говорит, что 28% студентов (1500 человек) дневной формы обучения активно вовлекаются в НИР через:

– участие в выполнении исследований по тематике плановых хоздоговорных и госбюджетных научно-исследовательских работ (в 2001 году 650 студентов реально работали по ХД и ГБ темам);

– организацию студенческих научных лабораторий (их сегодня в университете 10, а четыре поощрены премиями специального Фонда Президента Республики Беларусь);

– подготовку научных докладов на республиканские и международные конференции (в 2001 году количество таких докладов составило 980);

– опубликование статей (самостоятельно или в соавторстве с преподавателями) в республиканских и международных изданиях (в 2001 году таких научных публикаций было 455);

– участие в различных конкурсах творческих работ (в прошлом году 45 научных студенческих работ участвовали в конкурсе по естественным, техническим, гуманитарным и социально-экономическим наукам, 60% работ награждены Дипломами Министерства образования Республики Беларусь и денежными премиями. В 2001 году на Республиканский тур конкурса творческих работ студентов по общественным наукам «Беларусь в 21 веке» было представлено 11 исследований. 5 из них награждены денежными премиями, а их авторы – знаком «Лауреат специального Фонда Президента Республики Беларусь по социальной поддержке одаренных учащихся и студентов»).

Один из важнейших показателей НИРС – это число научно-педагогических сотрудников, руководящих студенческой наукой. В 2001 году этот показатель составил 270 (46% от общего количества профессорско-преподавательского состава университета).

Основные резервы повышения эффективности НИРС сегодня связаны, прежде всего, с анализом накопленного опыта практической реализации системы НИРС на конкретных специальностях и распространением такого опыта в университете. Нынче мы не можем удовлетвориться ни процентом вовлечения студентов в реальную научно-исследовательскую работу, ни процентом участия профессорско-преподавательского состава в руководстве этой работой (наши показатели в этих вопросах остаются ниже среднереспубликанских). Наряду с учебной и учебно-методической работой участие преподавателя в руководстве НИРС должно стать одним из важнейших показателей, по которому оценивается его работа при избрании на очередной пятилетний срок.

Бесспорно, должна развиваться сеть студенческих научно-исследовательских лабораторий. Создание такой из них сегодня реально на факультете физической культуры, где студенты занимаются научно-исследовательской работой с учетом специфики факультета (оздоровление различных групп населения в условиях экологической обстановки региона, отработка методик подготовки спортсменов различной квалификации).

По-видимому, студенческую научную лабораторию необходимо открыть на факультете психологии и довузовской подготовки. Определенный опыт по привлечению студентов к психологическому консультированию, участию в работе психологического театра, организации психологических мониторингов здесь уже накоплен. Подготовительная работа по открытию студенческой научно-исследовательской лаборатории «Алгебра и геометрия сложных систем» проведена на математическом факультете (руководитель – к.ф.-м.н., доцент А.Ф.Васильев). Студенческие центры по написанию истории нашего университета, юридическому консультированию, выполнению переводческих работ могут быть созданы, соответственно, на историческом и юридическом факультетах и факультете иностранных языков.

Обеспечить участие большинства студентов в научно-исследовательской работе призвана УИРС. В её содержании можно выделить две части. Первую составляет все то, что должно дать студенту представление о методах, приемах и принципах научно-исследовательской работы, добывания, обработки и анализа информации. Как правило, это делается через систему специальных учебных курсов, таких, например, как «Введение в специальность», «Современные методы научных исследований», «Современные технологии образования», «Инновационный менеджмент» и другие. Вторая составляющая УИРС предполагает выполнение заданий, лабораторных работ, курсовых и дипломных работ, содержащих элементы научных исследований, выполнение конкретных нетиповых заданий научно-исследовательского характера в период производственной и учебной практик.

В отличие от НИРС, выполняемой во внеучебное время, УИРС имеет обязательный директивный характер, а поэтому в её основе в большей степени лежат распорядительно-организационные методы управления. Надо отметить, что ректоратом, деканатами и кафедрами, научно-методическим советом университета и методическими советами факультетов много делается в направлении совершенствования и структуры рабочих учебных планов и содержания учебных программ, организации производственных и педагогических практик, системы подготовки и выполнения курсовых и дипломных работ. В то же время, в условиях реформирования высшего образования, мы должны определить направления по совершенствованию качества образования на основе внедрения обучающе-исследовательского принципа. Кратко выделим основные из них:

**1.Развитие имеющихся и введение новых учебных курсов (естественно, учитывая специфику факультетов и специальностей), направленных на изучение методики организации и проведения исследований.** Сегодня в ведущих вузах Республики Беларусь на такие курсы отводится от 40 до 200 часов за счет часов совета вуза или дополнительного обучения. К сожалению, в нашем университете только на специальностях «Биология», «АСОИ», «История» сохранился курс «Введение в специальность», а на других ничего подобного нет.

**2.Пересмотр и обновление содержания учебных программ,** которые сегодня наряду с фундаментом дисциплины должны отражать современные достижения науки и техники, не допускать перегрузки содержания и исключать дублирование содержания других дисциплин. Выборочный анализ ряда учебных программ, проведенный НМС университета, показывает, что порой, к сожалению, мы имеем и примитив в содержании, и перегрузку, и дублирование.

**3.Улучшение учебно-методического обеспечения учебных дисциплин**. Мы много делаем в этом направлении. Только в 2001 году преподавателями было подготовлено и издано более 140 видов учебно-методической литературы, причем 11 из них с грифом Министерства образования Республики Беларусь. Однако эти показатели нас сегодня не могут устраивать. Необходимо смелее переходить к изданию учебно-методических комплексов, которые включали бы тематические планы, учебные программы, базовые конспекты лекций, тест-контролирующие программы, практические пособия, практикумы и системы промежуточного и итогового контроля.

**4.Совершенствование методики и технологий преподавания**. С внедрением учебно-методических комплексов должны измениться позиции преподавателей и студентов в учебном процессе. Поскольку базовые конспекты будут у студентов на руках, то у преподавателей появится больше возможностей для обсуждения на лекциях проблемных вопросов, проведения контрольных мероприятий и консультирования. Вектор преподавательской деятельности смещается в сторону организации самостоятельной работы студентов. При наличии у студентов конспектов лекций уменьшается лекционная нагрузка преподавателей, больше внимания уделяется организации самостоятельной познавательной деятельности студентов. В связи с этим одна из ведущих задач – создание информационного банка данных лучшего опыта наших профессоров, доцентов, ассистентов по проведению интерактивных лекций и практических занятий, организации дискуссий, учебных игр, круглых столов и т.д.

**5.Совершенствование системы промежуточного и итогового контроля**. В этом направлении, в первую очередь, должна развиваться такая форма контроля знаний, как тест-контролирующие программы. Практика разработки и внедрения таких программ сложилась на математическом факультете в работе доцентов М.С. Долинского и А.Ф. Васильева. Кроме этого, следует развивать рейтинговую и другие системы постепенного накопления промежуточных оценок с предоставлением лучшим студентам возможности освобождения от экзаменов. Необходимо также шире внедрять внешний аудит на экзаменах и переходить на письменную форму приема экзаменов с проверкой результатов группой независимых экспертов.

**6.При выполнении дипломных работ необходимо решительнее уходить от реферативной тематики (она хороша при выполнении курсовых работ на младших курсах), а поручать студентам выполнение тех тем, которые носят исследовательский характер или связаны с решением конкретных прикладных и производственных задач**. Руководство курсовыми и дипломными работами следует поручать тем преподавателям, которые вносят в них элементы исследовательской работы.

**7.Более активными и эффективными должны стать практики**. И это касается не только производственных практик. Сегодня студенты-педагоги просят увеличить на практиках количество игровых элементов, творческих заданий; в вопросах воспитания и обучения проводить параллели с современностью, а не прошлым; проигрывать на семинарских занятиях ситуации, которые могут возникнуть на практике; посещать различные школы; анализировать состояние обучения и воспитания в них; изучать современные методики и технологии.

**8.Важнейшей особенностью процессов, происходящих в настоящее время в высшей школе, является внедрение информационных технологий и, в частности, систем дистанционного обучения.** В Республике Беларусь работы по внедрению информационных технологий проводятся Академией управления при Президенте Республики Беларусь, БГЭУ, БГУИР, БГПА и другими вузами. Огромный рывок в 1997-2001 годах в этой области сделал наш университет, внедряя информационные технологии в практику учебной, административной и научно-исследовательской работы. Показателем таких достижений является то, что в марте 2002 года в Ганновере на международной компьютерной выставке на стендах Республики Беларусь выставлялась и получила хорошую оценку система дистанционного обучения, разработанная группой преподавателей, аспирантов и студентов ГГУ (руководитель проекта – доцент М.С. Долинский).

Первоочередными в направлении внедрения информационных технологий являются следующие задачи:

– расширение парка компьютерной техники (в частности, создание современных компьютерных классов на экономическом и геолого-географическом факультетах);

– увеличение пропускной возможности существующего канала Интернет и укрепление корпоративной информационной сети университета с целью создания свободного доступа к информационным и вычислительным ресурсам, сосредоточенным в университете и в Интернет;

– разработка и внедрение методических основ и системологии поиска учебной, учебно-методической и научной информации в Интернет, завершение создания электронного каталога университетских библиотечных фондов;

– завершение создания электронной библиотеки учебно-методической литературы (техническая, методическая и организационная работа в этом направлении уже проведена, теперь необходимо кафедрам и методическому кабинету университета приступить к формированию и актуализации базы данных);

– создание математиками и физиками совместно с предприятием IBA студенческой научно-исследовательской лаборатории по разработке и внедрению новых информационных технологий;

– оборудование в университете современных лингвистических кабинетов мультимедийными средствами, позволяющими внедрять в практику изучения иностранных языков новейшие образовательные технологии.

**9.Факультету психологии и довузовской подготовки необходимо разработать перспективную схему сотрудничества с лицеями, гимназиями и школами города и области по внедрению ОИП в старших классах для подготовки абитуриентов**. Опыт такого сотрудничества в университете имеется. Прекрасно работают в этом направлении на физическом (В.О.Замятнин, И.Н.Яковцов), геолого-географическом (А.Н.Кусенков), математическом (М.С.Долинский) факультетах.

Активизация работы по внедрению ОИП в последнее время происходит и в связи с реформированием структуры высшей школы, переходом ее на многоуровневую систему подготовки специалистов (бакалавр-специалист, магистр). Вслед за БГУ и другие вузы республики начинают развертывать работу по переходу к подготовке бакалавров и магистров. Такие процессы коснулись и ГГУ. Планируется, что уже в этом году такая модель подготовки специалистов будет апробироваться на математическом, физическом факультетах, имеющих хороший кадровый потенциал (по 5-10 докторов наук и 25-40 кандидатов наук на факультете), развитые аспирантуры и общепризнанные научные школы. Кроме этого, на всех факультетах с сентября 2002 года развертываются программы бакалаврской подготовки объемом около 300 учебных часов.

В связи с указанными инновациями задача университета – разработать свою комплексную целевую программу вуза по переходу к многоуровневой системе подготовки специалистов. Эта программа должна содержать совокупность мероприятий по совершенствованию организации и изменению содержания учебного процесса, укреплению ВУЗа научно-педагогическими кадрами, развитию материально-технической базы и учебной инфраструктуры. Центральное место в этой программе должны занимать мероприятия по дальнейшему продвижению и внедрению обучающе-исследовательского принципа.

В XXI веке у того, кто научится управлять знанием, будут значительные преимущества перед тем, кто этим умением не овладеет. Из этого очевидного факта следует не менее очевидный вывод: нам всем необходимо много работать, чтобы подготовить выпускника, умеющего управлять знанием. От этого выигрывает и выпускник, и мы, ибо от этого выигрывает вся нация.

